КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________А.В.Макоўчык
“20” 10 2023 г.

Рэгістрацыйны № УД-31-2-68/вуч.

# СТАРАСЛАВЯНСКАЯ МОВА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура)**

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0113-02-2023 (02.08.2023, № 225), вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура (23.02.2023, № 048 – 2023/в)

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Д.В.Дзятко, загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
М.Р.Прыгодзіч, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар; А.У.Сідарэнка, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар ДУА "Гімназія № 18 г. Мінска" ___________ Ю.В.Новік

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 4 ад 23.11.2023 г.)

Загадчык кафедры ___________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 3 ад 19.12.2023 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела ___________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ___________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Стараславянская мова” прызначана для рэалізацыі на ўзроўні агульнай вышэйшай адукацыі ў межах модуля “Асновы мовазнаўства” (кампанента установы адукацыі). Ад папярэдняга тыпу вучэбнай праграмы яе адрозніваюць абноўлены і перакампанаваны змест, арыентацыя на кампетэнтнасны падыход у навучанні, значнае ўзмацненне ролі і часткі самастойнай работы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій.

Вучэбная дысцыпліна дае ўяўленне аб станаўленні стараславянскай мовы, разглядае заканамернасці яе функцыянавання ў розныя гістарычныя эпохі, шляхі фарміравання, развіцця і ўдасканалення стараславянскай мовы. Тэарэтычныя веды і практычныя ўменні і навыкі, набытыя студэнтамі пры вывучэнні курса “Стараславянская мова” адыгрываюць важную ролю ў прафесійнай падрыхтоўцы настаўніка-філолага: паказваюць культурную ролю стараславянскай мовы ў розныя гістарычныя перыяды, фарміруюць у студэнтаў устойлівыя навыкі аналізу моўных фактаў у помніках славянскага пісьменства. “Стараславянская мова” – вучэбная дысцыпліна, якая ўключае два раздзелы: фанетычныя і граматычныя працэсы ў праславянскай мове дапісьмовай эпохі і ў стараславянскай мове. Гэтая дысцыпліна дае ўяўленне пра старажытную кніжна-пісьмовую мову праваслаўных краін, пра функцыі агульнаславянскай літаратурнай мовы ў старажытны перыяд і пра яе значэнне ў гісторыі літаратурных моў паўднёвых і ўсходніх славян у пазнейшую гістарычную эпоху; разглядае розныя яе ўзроўні: лексіка-фразеалагічны, фанетычны, марфалагічны, сінтаксічны; тлумачыць з’явы стараславянскай мовы праз параўнанне і супастаўленне з іншымі славянскімі мовамі. Вучэбная дысцыпліна “Стараславянская мова” прызначана дапамагчы студэнтам атрымаць грунтоўныя веды пра фанетычную і граматычную сістэму стараславянскай мовы, яе сінтаксічныя і лексічныя асаблівасці; даць пэўнае ўяўленне пра асноўныя помнікі стараславянскай пісьменнасці, іх вызначальныя рысы.

Пры вывучэнні стараславянскай мовы прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яе з іншымі лінгвістычнымі прадметамі (гістарычнай граматыкай, дыялекталогіяй, гісторыяй беларускай літаратурнай мовы і інш.).

**Асноўныя мэты выкладання дысцыпліны:**

− развіць і ўдасканаліць лінгвістычную кампетэнцыю студэнта ў аналізе моўных фактаў праславянскай і стараславянскай мовы;

− сфарміраваць устаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

− выхаваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа і іншых славянскіх народаў у гістарычным кантэксце.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны “Стараславянская мова”**:

– даць навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя веды па гісторыі ўзнікнення і развіцця пісьменнасці ў славянскіх народаў;

– пазнаёміць студэнтаў з рознымі поглядамі вучоных на паходжанне старaславянскай мовы;

– раскрыць заканамернасці функцыянавання і культурную ролю стараславянскай мовы ў розныя гістарычныя перыяды;

– сфарміраваць устойлівыя навыкі лінгвістычнага аналізу моўных фактаў у помніках славянскага пісьменства;

– развіць і ўмацаваць навыкі практычнага выкарыстання тэарэтычных ведаў пры каменціраванні стараславянскіх помнікаў пісьменства.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.* Сярод лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь, “Стараславянская мова” займае адно з найважнейшых месцаў у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў. Гэта самастойная лінгвістычная дысцыпліна, якая мае свой прадмет вывучэння, метады і прыёмы аналізу.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.* Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь з наступнымі вучэбнымі дысцыплінамі “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Беларуская дыялекталогія”, “Гісторыя беларускай мовы”, “Практыкум па беларускай мове”.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Стараславянская мова” студэнт павінен:

**ведаць**:

– гісторыю ўзнікнення і развіцця пісьменнасці ў славянскіх народаў;

– культурную ролю стараславянскай мовы ў жыцці славян;

– фанетычную і граматычную сістэму стараславянскай мовы, лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці стараславянскай мовы;

– асноўныя помнікі стараславянскай мовы, іх вызначальныя рысы.

**умець**:

– класіфікаваць фанетычныя праславянскія і паўднёваславянскія з’явы;

– апісваць марфалагічныя асаблівасці часцін мовы ў стараславянскай мове;

– тлумачыць асобныя гістарычныя чаргаванні гукаў у розных групах славянскіх моў;

– выяўляць стараславянізмы ў сучаснай беларускай мове.

**валодаць:**

– уменнем сістэматызацыі стараславянскіх моўных фактаў;

– навыкамі аналізу моўных фактаў у помніках славянскага пісьменства;

– навыкамі практычнага выкарыстання тэарэтычных ведаў пры каменціраванні стараславянскіх помнікаў пісьменства.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Стараславянская мова” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнай кампетэнцыі **СК-6**: Характарызаваць і супастаўляць сучасныя славянскія мовы, улічваючы гісторыю паходжання славян, славянскіх моў і славянскай палеаграфіі.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне “Стараславянская мова” студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і

практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

*Структура зместу вучэбнай дысцыпліны*

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Найбольш перспектыўныя і эфектыўныя сучасныя інавацыйныя адукацыйныя сістэмы і тэхналогіі наступныя: вучэбна-метадычны комплекс, блочна-модульная, модульна-рэйтынгавая і крэдытная сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае ўводзіны і вучэбныя раздзелы (тэмы). Тэматычны змест вучэбнай дысцыпліны рэалізуецца ў наступных формах: практычныя заняткі, самастойная праца студэнтаў.

Вучэбная дысцыпліна на дзённым аддзяленні чытаецца на 1 курсе ў 2-ім семестры. У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Стараславянская мова” усяго адводзіцца 108 вучэбных гадзін, з якіх 58 – аўдыторныя (28 гадзін – лекцыі, 30 гадзін – практычныя) і 50 гадзін – самастойная праца.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая. Форма атэстацыі – залік.

*Размеркаванне гадзін у 2 семестры*

| се-местр | усяго гадзін | аўдытор-ныя | лекцый-ныя | прак-тычныя | самаст. работа | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 108 | 58 | 28 | 30 | 50 | залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**1. Уводзіны**

**1.1. Паняцце старaславянскай мовы**

Стараславянская мова як агульная для многіх славян найстаражытнейшая пісьмова-літаратурная (старажытна-царкоўнаславянская) мова. Лінгвістычнае, гісторыка-культурнае і навучальнае значэнне вывучэння стараславянскай мовы. Роля стараславянскай мовы ў гісторыі беларускай літаратурнай мовы.

**1.2. Славяне і славянскія мовы**

Паняцце праславянскай мовы як дапісьмовай фазы развіцця славянскіх моў. Месца стараславянскай мовы сярод іншых славянскіх моў. Народная (дыялектная) аснова стараславянскай мовы.

Грамадска-гістарычныя ўмовы ўзнікнення пісьменства ў славян. Пытанне пра ўзнікненне пісьменнасць у славян да Канстанціна (Кірылы) і Мяфодзія. Значэнне славянскага пісьменства ў барацьбе за культурную і дзяржаўную незалежнасць славян. Дзейнасць Канстанціна і Мяфодзія ў Паноніі і Вялікай Маравіі. Росквіт славянскага пісьменства ў Балгарыі ў IX – X стст. Прыняцце хрысціянства ўсходнімі славянамі; роля царкоўных кніг і стараславянскай мовы.

Славянскія азбукі, пытанне пра іх паходжанне. Кірылаўская азбука.

Найважнейшыя глагалічныя і кірылаўскія помнікі, іх кароткая палеаграфічная і моўная характарыстыка. Лёс стараславянскага пісьменства ў розных славянскіх краінах: помнікі з чэха-мараўскімі, сербскахарвацкімі і ўсходнеславянскімі асаблівасцямі.

Звесткі з гісторыі вывучэння стараславянскай мовы (адкрыццё, выданне і апісанне помнікаў, вывучэнне фанетыкі і граматыкі; працы М.В.Ламаносава, І.Добраўскага, А.Х.Вастокава, І.І.Сразнеўскага, П.Шафарыка, Ф.Міклашыча, В.Ягіча, П.Ф.Фартунатава, А.А.Шахматава, Я.Ф.Карскага, А.М.Сялішчава і інш.) Характарыстыка навуковай і навучальнай літаратуры па стараславянскай мове.

**2. Лексіка і фразеалогія стараславянскай мовы**

**2.1. Лексічны склад стараславянскай мовы**

Уяўныя стараславянізмы. Семантыка-тэматычная характарыстыка стараславянскай лексікі. Семантычныя дублеты. Лексіка стараславянскай мовы паводле паходжання. Невытворныя, вытворныя і складаныя словы. Найбольш прадуктыўныя спосабы словаўтварэння.

**2.2. Фразеалогія стараславянскай мовы**

Фразеалагізмы стараславянскага паходжання ў беларускай мове.

**3. Фанетычная сістэма стараславянскай мовы**

**3.1. Асаблівасці фанетычнай сістэмы праславянскай мовы**

Адлюстраванне ў стараславянскай мове праславянскай гукавой сістэмы позняга перыяду.

Рэалізацыя ў стараславянскай мове тэндэнцыі да кансалідацыі склада. Тэндэнцыя да ўзыходнай гучнасці склада (адкрытасць складоў – “закон адкрытага склада”). Дзеянне тэндэнцыі да гармоніі склада (“закон складовага сінгарманізму”) у стараславянскай мове.

**3.2. Сістэма галосных гукаў**

Фізіялагічная характарыстыка і класіфікацыя галосных гукаў, перадача іх на пісьме. Галосныя лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя, насавыя і ненасавыя (чыстыя), поўнага (доўгія і кароткія) і няпоўнага (звышкароткія, або рэдукаваныя) утварэння.

Паходжанне галосных гукаў стараславянскай мовы. Фарміраванне славянскай сістэмы галосных гукаў на базе сістэмы галосных індаеўрапейскай мовы-асновы і на базе славянскага моўнага матэрыялу.

**3.3. Паходжанне галосных гукаў**

Узнікненне праславянскіх галосных [**а**], [**о**], [**е**], [**ы**], [**ь**], [**ъ**] на месцы доўгіх і кароткіх галосных індаеўрапейскай мовы (тэндэнцыя да пераўтварэння колькасных адрозненняў індаеўрапейскіх галосных у якасныя). Пераўтварэнні славянскіх галосных [**ě**] (h) у [**а**], [**о**] у [**е**]. З'яўленне славянскіх галосных [**у**], [**ę**] (В), [**ǫ**] (@) у выніку дзеяння тэндэнцыі да ўзыходнай гучнасці склада: змяненне індаеўрапейскіх дыфтонгаў у манафтонгі (манафтангізацыя дыфтонгаў) перад зычным і на канцы слова; змяненне дыфтангічных спалучэнняў галоснага і насавога зычнага ў закрытым складзе. Галосныя дваякага паходжання: манафтангічныя і дыфтангічныя [**и**], [**ě**] (h).

**3.4. Сістэма зычных гукаў, іх паходжанне**

Фізіялагічная характарыстыка і класіфікацыя зычных гукаў, перадача іх на пісьме. Суадноснасць зычных паводле цвёрдасці-мяккасці ў стараславянскай мове. Зычныя цвёрдыя, мяккія і памякчоныя. Складаўтваральныя плаўныя. Паходжанне зычных гукаў стараславянскай мовы. Паходжанне цвёрдых зычных. Паходжанне цвёрдых санорных гукаў, а таксама гукаў [**к**], [**х**], [**с**] і [**з**]. З'яўленне славянскага фрыкатыўнага звонкага гука [**в**]. Фрыкатыўны глухі гук [**ф**] у стараславянскай мове, яго паходжанне. Паходжанне мяккіх зычных. Зычны [**j**] і яго паходжанне.

Палаталізацыя (памякчэнне) зычных пад уздзеяннем галосных пярэдняга рада:

1) пераходнае памякчэнне заднеязычных;

2) лёс спалучэнняў **gv**, **kv**, **chv** перад галоснымі пярэдняга рада [**і**] і [**ě**] (h) дыфтангічнага паходжання;

3) змяненне спалучэнняў **sk**, **zg** перад галоснымі пярэдняга рада;

4) змяненне груп зычных **kt**, **gt** перад галоснымі пярэдняга рада ў розных славянскіх мовах.

Памякчэнне зычных перад [**j**]. Вынікі пераўтварэнняў праславянскіх спалучэнняў **rj**, **nj**, **lj**, **gj**, **kj**, **chj**, **sj**, **zj**, **skj**, **zgj**, **zdj**, **stj**; змяненні спалучэнняў **dj**, **tj**, а таксама **bj**, **pj**, **mj**, **vj**; лёс спалучэнняў тыпу **slj**, **snj**, **drj** і некаторых іншых.

Чаргаванні зычных, выкліканыя ўздзеяннем галосных пярэдняга рада і [**j**].

**3.5. Пазіцыйныя змяненні галосных і зычных гукаў**

Рэдукаваныя (звышкароткія) галосныя [**ь**], [**ъ**]. Змяненне іх перад **і**, **j** у рэдукаваныя (звышкароткія) [**и**], [**ы**]. Узнікненне рэдукаваных (звышкароткіх) [**и**], [**ы**] на месцы галосных поўнага ўтварэння [**и**], [**ы**] перад **j**. Рэдукаваны [**и**] на месцы спалучэння **jь**. Перадача рэдукаваных (звышкароткіх) [**и**], [**ы**] на пісьме. Моцная і слабая пазіцыя рэдукаваных (звышкароткіх). Падзенне рэдукаваных (звышкароткіх) галосных і змены, выкліканыя гэтым працэсам. Вынікі падзення рэдукаваных (звышкароткіх).

Галосныя гукі ў пачатку слова. Галосныя, якія маглі пачынаць слова ў старaславянскай мове. Прыстаўныя зычныя [**в**] і [**j**] перад пачатковымі галоснымі. Пачатковыя ~ і **е**, **а** і **В**, **ю** і **оу** ў помніках стараславянскага пісьменства.

Чаргаванне галосных гукаў. Узнікненне і характар індаеўрапейскіх чаргаванняў галосных. Колькасныя, якасныя і якасна-колькасныя чаргаванні. Асноўныя тыпы чаргаванняў галосных у славянскіх мовах. Марфалагічнае значэнне чаргаванняў галосных у славянскіх мовах.

**3.6. Пазіцыйныя змяненні галосных і зычных гукаў**

Спалучэнне плаўных *r* і *l* з галоснымі. Змяненне дыфтангічных спалучэнняў *__or__, *__ol__, *__er__, *__el__ паміж зычнымі. Дыфтангічныя спалучэнні *__or__, *__ol__ у пачатку слова перад зычным і лёс спалучэнняў тыпу *__ort__, *__olt__ у славянскіх мовах. Праславянскія спалучэнні плаўных з рэдукаванымі (звышкароткімі) [**ь**], [**ъ**] тыпу *__trьt__, *__tlьt__, *__trъt__, *__tlъt__ у стараславянскай і іншых славянскіх мовах.

Спрашчэнне груп зычных. Спрашчэнне груп зычных у праславянскі перыяд і адлюстраванне гэтага спрашчэння ў стараславянскай мове. Змяненне спалучэнняў **ds**, **ts**, **bs**, **ss**, **ps** у s; **ks** у **ch**; **pn**, **dn**, **tn**, **dn** у **n**; **dt**, **pt** у **t**; **dm**, **tm** у **m**; **dv** у **v**; **skn** у **sn**; **kst** у **st**. Пытанне аб спрашчэнні спалучэнняў **dl**, **tl** у **l**.

Дысіміляцыя ў спалучэннях **dt** і **tt**.

Змяненні ў канцы слова: страта канцавога зычнага; рэдукцыя канцавых галосных і інш.

**4. Марфалогія стараславянскай мовы**

**4.1 Назоўнік**

Катэгорыя роду, ліку і склону. Тыпы скланення назоўнікаў: з асновай на *__ā__, *__jā__; з асновай на *__ŏ__, *__jŏ;__ з асновай на *__ŭ;__ з асновай на *__ĭ;__ з асновай на зычны гук (*-__n__-, *-__es__-, *-__ent__-, *-__en__-, *-__er__-); з асновай на *__ū__. Цвёрдыя і мяккія варыянты скланення назоўнікаў. Чаргаванні зычных гукаў асновы пры ўтварэнні склонавых формаў.

Узнікненне катэгорыі адушаўлёнасці.

Адлюстраванне ў помніках пісьменнасці тэндэнцыі да ўніфікацыі некаторых склонавых формаў.

**4.2. Граматычныя асаблівасці назоўнікаў**

1. Катэгорыя роду, ліку і склону.

2. Тыпы скланення назоўнікаў: з асновай на *__ā__, *__jā__; з асновай на *__ŏ__, *__jŏ;__ з асновай на *__ŭ;__ з асновай на *__ĭ;__ з асновай на зычны гук (*-__n__-, *-__es__-, *-__ent__-, *-__en__-, *-__er__-); з асновай на *__ū__. Цвёрдыя і мяккія варыянты скланення назоўнікаў.

3. Чаргаванні зычных гукаў асновы пры ўтварэнні склонавых формаў.

**4.3. Займеннік. Асабовыя займеннікі**

Асабовыя займеннікі 1-ай і 2-ой асобы (азъ, ты) і зваротны займеннік себе, іх скланенне. Поўныя і энклітычныя формы асабовых і зваротнага займеннікаў, іх ужыванне. Спосабы выражэння 3-яй асобы формамі ўказальных займеннікаў è ‘той’ (", ~), онъ (оно, она).

**4.4. Займеннік. Несабовыя займеннікі**

Неасабовыя займеннікі, іх класіфікацыя паводле значэння. Скланенне неасабовых займеннікаў, якія маюць катэгорыю роду і ліку: займеннікі цвёрдай (тъ ‘той’, то, та) і мяккай (è ‘той’, ", ~) разнавіднасцей. Асаблівасці скланення

займенніка вьсь ‘увесь’. Скланенне неасабовых займеннікаў, якія не мелі катэгорый роду і ліку (къто, чьто).

**4.5. Прыметнік. Разрады прыметнікаў**

Разрады прыметнікаў у старaславянскай мове. Утварэнне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.

Кароткія (іменныя) і поўныя (членныя, займеннікавыя) формы прыметнікаў; адрозненне ў іх граматычным значэнні і сінтаксічным ужыванні.

Скланенне кароткіх (іменных) прыметнікаў. Утварэнне і асаблівасці скланення поўных (членных, займеннікавых) прыметнікаў. Фанетычныя пераўтварэнні ў канчатках поўных прыметнікаў.

**4.6. Прыметнік. Ступені параўнання якасных прыметнікаў**

Утварэнне кароткіх і поўных формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў. Суплетыўныя формы пры ўтварэнні вышэйшай ступені параўнання. Скланенне кароткіх і поўных формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў. Утварэнне найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў.

**4.7. Лікавыя словы**

Лікавыя словы ў старaславянскай мове. Класіфікацыя іх паводле аднесенасці з часцінамі мовы. Утварэнне складаных лікавых слоў і перадача іх на пісьме. Асаблівасці скланення лікавых слоў.

**4.8. Дзеяслоў**

Агульныя граматычныя катэгорыі старaславянскага дзеяслова. Спрагальныя і неспрагальныя (іменныя) дзеяслоўныя формы. Дзеяслоўныя асновы: аснова цяперашняга часу і аснова інфінітыва. Дзеяслоўныя формы простыя і складаныя.

**4.9. Сістэма часоў дзеяслова. Лад дзеяслова**

Формы цяперашняга часу. Тэматычныя і нетэматычныя дзеясловы. Размеркаванне дзеясловаў па класах. Чаргаванні галосных у дзеяслоўных парадыгмах.

Сістэма прошлых часоў. Простыя формы. Аорыст, яго значэнне. Аорыст просты і сігматычны. Імперфект, яго значэнне, утварэнне і спражэнне. Складаныя формы. Перфект і плюсквамперфект, іх значэнне, утварэнне, спражэнне.

Сістэма будучых часоў. Будучы просты, будучы складаны I і будучы складаны II.

Утварэнне формаў загаднага і ўмоўнага ладу.

Іменныя формы дзеяслова. Інфінітыў і супін, іх утварэнне.

**4.10. Дзеепрыметнік**

Дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу незалежнага і залежнага станаў. Скланенне іменных (нячленных) і поўных (членных) дзеепрыметнікаў.

**4.11. Прыслоўе**

Разрады прыслоўяў па значэнні (прыслоўі месца, часу, меры, спосабу дзеяння і інш.) Класіфікацыя прыслоўяў паводле паходжання. Утварэнне прыслоўяў.

**4.12. Службовыя часціны мовы**

Прыназоўнік. Першасныя (невытворныя) і новыя (вытворныя) прыназоўнікі, іх ужыванне ў пісьмовых крыніцах. Злучнік. Злучнікі простыя і складаныя. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі ў старaславянскай мове. Часціцы. Найбольш распаўсюджаныя ў старaславянскай мове часціцы і іх значэнні.

## 5. Сінтаксіс стараславянскай мовы

### 5.1. Словазлучэнне

Асаблівасці дапасавання ў стараславянскай мове. Дапасаванне па сэнсу. Беспрыназоўнікавае і прыназоўнікавае кіраванне.

### 5.2. Просты і складаны сказы

Парадак слоў у сказе. Спосабы выражэння дзейніка і выказніка і асаблівасці іх каардынацыі. Канструкцыі з падвойнымі склонамі. Дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні. Адмоўныя сказы. Аднасастаўныя сказы.

Складаныя сказы са злучнікамі і без злучнікаў. Складаназалежныя сказы. Ужыванне злучнікаў і злучальных слоў. Зварот “давальны самастойны”. Спосабы перадачы чужой мовы.

## Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная праца | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | |
| **СТАРАСЛАВЯНСКАЯ МОВА** | | **28** | **30** | **50** | | |
| **1.** | **Уводзіны** | **2** | **4** | **4** | | |
| 1.1 | **Паняцце старaславянскай мовы**<br>1. Старaславянская мова як агульная для многіх славян найстаражытнейшая пісьмова-літаратурная (старажытна-царкоўнаславянская) мова.<br>2. Лінгвістычнае, гісторыка-культурнае і навучальнае значэнне вывучэння старaславянскай мовы.<br>3. Роля старaславянскай мовы ў гісторыі беларускай літаратурнай мовы. | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Рэфераты |
| 1.2 | **Славяне і славянскія мовы**<br>1. Паняцце праславянскай мовы як дапісьмовай фазы развіцця славянскіх моў. Месца старaславянскай мовы сярод іншых славянскіх моў. Народная (дыялектная) аснова старaславянскай мовы.<br>2. Грамадска-гістарычныя ўмовы ўзнікнення пісьменства ў славян. Пытанне пра ўзнікненне пісьменнасць у славян да Канстанціна (Кірылы) і Мяфодзія. Значэнне славянскага пісьменства ў барацьбе за культурную і дзяржаўную незалежнасць славян. Дзейнасць Канстанціна і Мяфодзія ў Панонії і Вялікай Маравії. Росквіт славянскага пісьменства ў Балгарыі ў IX – X стст. Прыняцце хрысціянства ўсходнімі славянамі; роля царкоўных кніг і старaславянскай мовы.<br>3. Славянскія азбукі, пытанне пра іх паходжанне. Кірылаўская азбука.<br>Найважнейшыя глагалічныя і кірылаўскія помнікі, іх кароткая палеаграфічная і моўная характарыстыка. Лёс старaславянскага пісьменства ў розных славянскіх краінах: помнікі з чэха-мараўскімі, сербскахарвацкімі і ўсходнеславянскімі асаблівасцямі.<br>4. Звесткі з гісторыі вывучэння старaславянскай мовы (адкрыццё, выданне і апісанне помнікаў, вывучэнне фанетыкі і граматыкі; працы М.В.Ламаносава, І.Добраўскага, А.Х.Вастокава, І.І.Сразнеўскага, П.Шафарыка, Ф.Міклашыча, В.Ягіча, П.Ф.Фартунатава, А.А.Шахматава, Я.Ф.Карскага, А.М.Сялішчава і інш.) Характарыстыка навуковай і навучальнай літаратуры па старaславянскай мове. | | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Ушчыльненае (камбінаванае) апытванне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Лексіка і фразеалогія стараславянскай мовы** | **2** | **2** | **6** | | |
| 2.1. | **Лексічны склад стараславянскай мовы**<br>1. Уяўныя стараславянізмы. Семантыка-тэматычная характарыстыка стараславянскай лексікі. Семантычныя дублеты.<br>2. Лексіка стараславянскай мовы паводле паходжання.<br>3. Невытворныя, вытворныя і складаныя словы.<br>4. Найбольш прадуктыўныя спосабы словаўтварэння. | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Ушчыльнае (камбінаванае) апытванне |
| 2.2. | **Фразеалогія стараславянскай мовы**<br>Фразеалагізмы стараславянскага паходжання ў беларускай мове. | | | 4 | 1,2 1д, 2д, 3д | Тэрміналагічны дыктант |
| **3.** | **Фанетычная сістэма стараславянскай мовы** | **8** | **12** | **14** | | |
| 3.1. | **Асаблівасці фанетычнай сістэмы праславянскай мовы**<br>1. Адлюстраванне ў стараславянскай мове праславянскай гукавой сістэмы позняга перыяду.<br>2. Рэалізацыя ў стараславянскай мове тэндэнцыі да кансалідацыі склада.<br>3. Тэндэнцыя да ўзыходнай гучнасці склада (адкрытасць складоў – “закон адкрытага склада”).<br>4. Дзеянне тэндэнцыі да гармоніі склада (“закон складовага сінгарманізму”) у стараславянскай мове. | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Тэрміналагічны дыктант |
| 3.2. | **Сістэма галосных гукаў**<br>1. Фізіялагічная характарыстыка і класіфікацыя галосных гукаў, перадача іх на пісьме.<br>2. Паходжанне галосных гукаў стараславянскай мовы. Тэндэнцыя ўзыходнай гучнасці склада, тэндэнцыя складовага сінгарманізму. Галосныя манафтангічнага, дыфтангічнага і дваякага паходжання.<br>3. Фізіялагічная характарыстыка і класіфікацыя галосных гукаў, перадача іх на пісьме. | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Індывідуальнае апытванне |
| 3.3. | **Паходжанне галосных гукаў**<br>1. Узнікненне праславянскіх галосных [**а**], [**о**], [**е**], [**ы**], [**ь**], [**ъ**] на месцы доўгіх і кароткіх галосных індаеўрапейскай мовы (тэндэнцыя да пераўтварэння колькасных адрозненняў індаеўрапейскіх галосных у якасныя).<br>2. Пераўтварэнні славянскіх галосных [**ě**] (h) у [**а**], [**о**] у [**е**]. З’яўленне славянскіх галосных [**у**], [**ę**] (В), [**ç**] (@) у выніку дзеяння тэндэнцыі да ўзыходнай гучнасці склада: змяненне індаеўрапейскіх дыфтонгаў у манафтонгі (манафтангізацыя дыфтонгаў) перад зычным і на канцы слова; змяненне дыфтангічных спалучэнняў галоснага і насавога зычнага ў закрытым складзе.<br>3. Галосныя дваякага паходжання: манафтангічныя і дыфтангічныя [**и**], [**ě**] (h). | | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, каментарыі стараславянскіх тэкстаў |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.4. | **Сістэма зычных гукаў, іх паходжанне**<br>1. Фізіялагічная характарыстыка і класіфікацыя зычных гукаў, перадача іх на пісьме. Суадноснасць зычных паводле цвёрдасці-мяккасці ў старaславянскай мове. Зычныя цвёрдыя, мяккія і памякчоныя.<br>2. Складаўтваральныя плаўныя.<br>3. Паходжанне зычных гукаў старaславянскай мовы.<br>4. Паходжанне цвёрдых зычных.<br>5. Паходжанне цвёрдых санорных гукаў, а таксама гукаў [**к**], [**х**], [**с**] і [**з**]. З'яўленне славянскага фрыкатыўнага звонкага гука [**в**].<br>6. Фрыкатыўны глухі гук [**ф**] у старaславянскай мове, яго паходжанне.<br>7. Паходжанне мяккіх зычных.<br>8. Зычны [**j**] і яго паходжанне.<br>9. Палаталізацыя (памякчэнне) зычных пад уздзеяннем галосных пярэдняга рада:<br>1) пераходнае памякчэнне заднеязычных;<br>2) лёс спалучэнняў **gv**, **kv**, **chv** перад галоснымі пярэдняга рада [**і**] і [**ě**] (h) дыфтангічнага паходжання;<br>3) змяненне спалучэнняў **sk**, **zg** перад галоснымі пярэдняга рада;<br>4) змяненне груп зычных **kt**, **gt** перад галоснымі пярэдняга рада ў розных славянскіх мовах.<br>10. Памякчэнне зычных перад [**j**]. Вынікі пераўтварэнняў праславянскіх спалучэнняў **rj**, **nj**, **lj**, **gj**, **kj**, **chj**, **sj**, **zj**, **skj**, **zgj**, **zdj**, **stj**; змяненні спалучэнняў **dj**, **tj**, а таксама **bj**, **pj**, **mj**, **vj**; лёс спалучэнняў тыпу **slj**, **snj**, **drj** і некаторых іншых.<br>11. Чаргаванні зычных, выкліканыя ўздзеяннем галосных пярэдняга рада і [**j**]. | 2 | 2 | 2 | 1,<br>2,<br>1д,<br>2д,<br>3д | Пісьмовы аналіз стараславянскага тэксту |
| 3.5. | **Пазіцыйныя змяненні галосных і зычных гукаў**<br>1. Рэдукаваныя (звышкароткія) галосныя [**ь**], [**ъ**].<br>2. Змяненне іх перад **і**, **j** у рэдукаваныя (звышкароткія) [**и**], [**ы**].<br>3. Узнікненне рэдукаваных (звышкароткіх) [**и**], [**ы**] на месцы галосных поўнага ўтварэння [**и**], [**ы**] перад **j**.<br>4. Рэдукаваны [**и**] на месцы спалучэння **jь**. Перадача рэдукаваных (звышкароткіх) [**и**], [**ы**] на пісьме.<br>5. Моцная і слабая пазіцыя рэдукаваных (звышкароткіх).<br>6. Падзенне рэдукаваных (звышкароткіх) галосных і змены, выкліканыя гэтым працэсам. Вынікі падзення рэдукаваных (звышкароткіх).<br>7. Галосныя гукі ў пачатку слова. Галосныя, якія маглі пачынаць слова ў старaславянскай мове. Прыстаўныя зычныя [**в**] і [**j**] перад пачатковымі галоснымі. Пачатковыя ~ і **е**, **а** і **В**, **ю** і **оу** ў помніках старaславянскага пісьменства.<br>8. Чаргаванне галосных гукаў. Узнікненне і характар індаеўрапейскіх чаргаванняў галосных. Колькасныя, якасныя і якасна-колькасныя чаргаванні. Асноўныя тыпы чаргаванняў галосных у славянскіх мовах. Марфалагічнае значэнне чаргаванняў галосных у славянскіх мовах. | 2 | 2 | 2 | 1,<br>2,<br>1д,<br>2д,<br>3д | Тэрміналагічны дыктант |
| 3.6 | **Пазіцыйныя змяненні галосных і зычных гукаў**<br>1. Спалучэнне плаўных *r* і *l* з галоснымі. Змяненне дыфтангічных спалучэнняў ***or**, ***ol**, ***er**, ***el** | | 2 | 4 | 1,<br>2, | Франтальнае апыт- |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | паміж зычнымі. Дыфтангічныя спалучэнні **or*, *ol у пачатку слова перад зычным і лёс спалучэнняў тыпу ***ort**, ***olt** у славянскіх мовах. Праславянскія спалучэнні плаўных з рэдукаванымі (звышкароткімі) [**ь**], [**ъ**] тыпу ***trьt**, ***tlьt**, ***trъt**, ***tlъt** у стараславянскай і іншых славянскіх мовах.<br>2. Спрашчэнне груп зычных. Спрашчэнне груп зычных у праславянскі перыяд і адлюстраванне гэтага спрашчэння ў стараславянскай мове. Змяненне спалучэнняў **ds**, **ts**, **bs**, **ss**, **ps** у **s**; **ks** у **ch**; **pn**, **dn**, **tn**, **dn** у **n**; **dt**, **pt** у **t**; **dm**, **tm** у **m**; **dv** у **v**; **skn** у **sn**; **kst** у **st**. Пытанне аб спрашчэнні спалучэнняў **dl**, **tl** у **l**.<br>3. Дысіміляцыя ў спалучэннях **dt** і **tt**.<br>4. Змяненні ў канцы слова: страта канцавога зычнага; рэдукцыя канцавых галосных і інш. | | | | 1д,<br>2д,<br>3д | ванне |
| **4.** | **Марфалогія стараславянскай мовы** | **12** | **10** | **22** | | |
| 4.1. | **Назоўнік**<br>1. Катэгорыя роду, ліку і склону.<br>2. Тыпы скланення назоўнікаў: з асновай на ***ā**, ***jā**; з асновай на ***ŏ**, ***jŏ;** з асновай на ***ŭ;** з асновай на ***ĭ;** з асновай на зычны гук (*-**n-**, *-**es-**, *-**ent-**, *-**en-**, *-**er-**); з асновай на ***ū**. Цвёрдыя і мяккія варыянты скланення назоўнікаў. Чаргаванні зычных гукаў асновы пры ўтварэнні склонавых формаў.<br>3. Узнікненне катэгорыі адушаўлёнасці. Адлюстраванне ў помніках пісьменнасці тэндэнцыі да ўніфікацыі некаторых склонавых формаў. | 2 | | 2 | 1,<br>2,<br>1д,<br>2д,<br>3д | Ушчыльненае (камбінаванае) апытванне |
| 4.2. | **Граматычныя асаблівасці назоўнікаў**<br>1. Катэгорыя роду, ліку і склону.<br>2. Тыпы скланення назоўнікаў: з асновай на ***ā**, ***jā**; з асновай на ***ŏ**, ***jŏ;** з асновай на ***ŭ;** з асновай на ***ĭ;** з асновай на зычны гук (*-**n-**, *-**es-**, *-**ent-**, *-**en-**, *-**er-**); з асновай на ***ū**. Цвёрдыя і мяккія варыянты скланення назоўнікаў.<br>3. Чаргаванні зычных гукаў асновы пры ўтварэнні склонавых формаў. | | 2 | 2 | 1,<br>2,<br>1д,<br>2д,<br>3д | Тэрміналагічны дыктант |
| 4.3. | **Займеннік. Асабовыя займеннікі**<br>1. Асабовыя займеннікі 1-ай і 2-ой асобы (азъ, ты) і зваротны займеннік себе, іх скланенне.<br>2. Поўныя і энклітычныя формы асабовых і зваротнага займеннікаў, іх ужыванне.<br>3. Спосабы выражэння 3-яй асобы формамі ўказальных займеннікаў è ‘той’ (",   ~), онъ (оно, она). | 2 | | | 1,<br>2,<br>1д,<br>2д,<br>3д | Пісьмовыя работы па дамашніх практыкаваннях |
| 4.4. | **Займеннік. Несабовыя займеннікі**<br>1. Неасабовыя займеннікі, іх класіфікацыя паводле значэння.<br>2. Скланенне неасабовых займеннікаў, якія маюць катэгорыю роду і ліку: займеннікі цвёрдай (тъ ‘той’, то, та) і мяккай (è ‘той’, ", ~) разнавіднасцей.<br>3. Асаблівасці скланення займенніка вьсь ‘увесь’.<br>4. Скланенне неасабовых займеннікаў, якія не мелі катэгорый роду і ліку (къто, чьто). | | 2 | 4 | 1,<br>2,<br>1д,<br>2д,<br>3д | Пісьмовы аналіз стараславянскага тэксту |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.5. | **Прыметнік. Разрады прыметнікаў**<br>1. Разрады прыметнікаў у стараславянскай мове.<br>2. Утварэнне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.<br>3. Кароткія (іменныя) і поўныя (членныя, займеннікавыя) формы прыметнікаў; адрозненне ў іх граматычным значэнні і сінтаксічным ужыванні.<br>4. Скланенне кароткіх (іменных) прыметнікаў.<br>5. Утварэнне і асаблівасці скланення поўных (членных, займеннікавых) прыметнікаў.<br>6. Фанетычныя пераўтварэнні ў канчатках поўных прыметнікаў. | 2 | | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Пісьмовы аналіз стараславянскага тэксту |
| 4.6. | **Прыметнік. Ступені параўнання якасных прыметнікаў**<br>1. Утварэнне кароткіх і поўных формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў.<br>2. Суплетыўныя формы пры ўтварэнні вышэйшай ступені параўнання.<br>3. Скланенне кароткіх і поўных формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў.<br>4. Утварэнне найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў. | | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, гістарычныя каментарыі старажытных тэкстаў |
| 4.7. | **Лікавыя словы**<br>1. Лікавыя словы ў стараславянскай мове.<br>2. Класіфікацыя іх паводле аднесенасці з часцінамі мовы.<br>3. Утварэнне складаных лікавых слоў і перадача іх на пісьме.<br>4. Асаблівасці скланення лікавых слоў. | 1 | | | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Франтальнае апытванне |
| 4.8. | **Дзеяслоў**<br>1. Агульныя граматычныя катэгорыі стараславянскага дзеяслова.<br>2. Спрагальныя і неспрагальныя (іменныя) дзеяслоўныя формы.<br>3. Дзеяслоўныя асновы: аснова цяперашняга часу і аснова інфінітыва.<br>4. Дзеяслоўныя формы простыя і складаныя. | 2 | | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Тэрміналагічны дыктант |
| 4.9. | **Сістэма часоў дзеяслова. Лад дзеяслова**<br>1. Формы цяперашняга часу.<br>2. Тэматычныя і нетэматычныя дзеясловы.<br>3. Размеркаванне дзеясловаў па класах.<br>4. Чаргаванні галосных у дзеяслоўных парадыгмах.<br>5. Сістэма прошлых часоў.<br>6. Простыя формы.<br>7. Аорыст, яго значэнне.<br>8. Аорыст просты і сігматычны.<br>9. Імперфект, яго значэнне, утварэнне і спражэнне.<br>10. Складаныя формы.<br>11. Перфект і плюсквамперфект, іх значэнне, утварэнне, спражэнне.<br>12. Сістэма будучых часоў. | | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, гістарычныя каментарыі старажытных тэкстаў |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 13. Будучы просты, будучы складаны I і будучы складаны II.<br>14. Утварэнне формаў загаднага і ўмоўнага ладу.<br>15. Іменныя формы дзеяслова. Інфінітыў і супін, іх утварэнне. | | | | | |
| 4.10. | **Дзеепрыметнік**<br>1. Дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу незалежнага і залежнага станаў.<br>2. Скланенне іменных (нячленных) і поўных (членных) дзеепрыметнікаў. | 1 | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Пісьмовыя работы па дамашніх практыкаваннях |
| 4.11. | **Прыслоўе**<br>1. Разрады прыслоўяў па значэнні (прыслоўі месца, часу, меры, спосабу дзеяння і інш.)<br>2. Класіфікацыя прыслоўяў паводле паходжання.<br>3. Утварэнне прыслоўяў. | 1 | | 2 | 1, 2, 1д, 2д | Пісьмовы аналіз стараславянскага тэксту |
| 4.12. | **Службовыя часціны мовы**<br>1. Прыназоўнік. Першасныя (невытворныя) і новыя (вытворныя) прыназоўнікі, іх ужыванне ў пісьмовых крыніцах.<br>2. Злучнік. Злучнікі простыя і складаныя. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі ў стараславянскай мове.<br>3. Часціцы. Найбольш распаўсюджаныя ў стараславянскай мове часціцы і іх значэнні. | 1 | | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Пісьмовы аналіз стараславянскага тэксту |
| **5.** | **Сінтаксіс** | **4** | **2** | **4** | | |
| 5.1. | **Словазлучэнне**<br>1. Асаблівасці дапасавання ў стараславянскай мове. Дапасаванне па сэнсу.<br>2. Беспрыназоўнікавае і прыназоўнікавае кіраванне. | 2 | | 2 | 1,2 1д, 2д, 3д | Пісьмовы аналіз стараславянскага тэксту |
| 5.2. | **Просты і складаны сказы**<br>1. Парадак слоў у сказе. Спосабы выражэння дзейніка і выказніка і асаблівасці іх каардынацыі. Канструкцыі з падвойнымі склонамі. Дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні. Адмоўныя сказы. Аднасастаўныя сказы.<br>2. Складаныя сказы са злучнікамі і без злучнікаў. Складаназалежныя сказы. Ужыванне злучнікаў і злучальных слоў. Зварот “давальны самастойны”.<br>3. Спосабы перадачы чужой мовы.<br>4. Парадак слоў у сказе. Спосабы выражэння дзейніка і выказніка і асаблівасці іх каардынацыі. Канструкцыі з падвойнымі склонамі. Дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні. Адмоўныя сказы. Аднасастаўныя сказы.<br>5. Складаныя сказы са злучнікамі і без злучнікаў. Складаназалежныя сказы. Ужыванне злучнікаў і злучальных слоў. Зварот “давальны самастойны”.<br>6. Спосабы перадачы чужой мовы. | 2 | 2 | 2 | 1, 2, 1д, 2д, 3д | Пісьмовы аналіз стараславянскага тэксту |
| ***Усяго гадзін у 2 семестры: 108 г.*** | | **28** | **30** | **50** | | ***Залік*** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Старославянский язык [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс для специальностей 1–02 03 02 «Русский язык и литература», 1–02 03 04 «Русский язык и литература. Иностранный язык» / сост. Н. В. Соловьева // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: https://elib.bspu.by/handle/doc/44071. – Дата доступу: 23.05.2023.

**Дадатковая літаратура**

1. Бондалетов, В. Д. Старославянский язык. Таблицы. Тексты : учеб. слов. / В. Д. Бондалетов, Н. Г. Самсонов, Л. Г. Самсонова ; под ред. В. Д. Бондалетова. – 6-е изд., стер. – М. : Флинта, 2012. – 296 с.
2. Круталевич, М. М. Стараславянская мова : падруч. установ выш. адукацыі / М. М. Круталевіч, А. А. Каўрус. − Мінск : Рэсп. ін-т выш. адукацыі, 2021. – 394 с.
3. Мароз, С. С. Стараславянская мова : практыкум / С. С. Мароз, М. С. Ржавуцкая, С. І. Фацеева. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2005. – 137 с.
4. Собалева, Л. І. Стараславянская мова : метад. указанні і пытанні да практ. заняткаў / Л. І. Собалева, В. В. Патапава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2008. – 57 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з'яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодваць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з'яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады і формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на даную падрыхтоўку.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённага аддзялення накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб'ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад месца і часу правядзення самастойнай працы, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтамі дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна можа прадугледжваць:

– выкананне самастойных прац;

– выкананне кантрольных прац, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых прац;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя віды заданняў для самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плана тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі; азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для замацавання і сістэматызацыі ведаў, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;

– складанне бібліяграфіі і інш.;

Для фарміравання ўменняў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыя- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод канкрэтных відаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю);

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосабу з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю);

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю, дзякуючы чаму, самастойная работа набывае даследчы характар).

Для правядзення кантролю самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– семінарскія заняткі;

– калёквіумы;
– канферэнцыі;
– залікі па тэмах / раздзелах;
– тэсціраванне;
– кантрольныя работы;
– вусны і пісьмовы экзамены.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляецца карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойных прац, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г. д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з’яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;
– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;
– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;
– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;
– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкцыі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай работы з’яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні запланаванай работы. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г. з. зрабіць гэтыя недахопы аб’ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

| № н/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СПС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Паняцце старaславянскай мовы** (Старaславянская мова як агульная для многіх славян найстаражытнейшая пісьмова-літаратурная (старажытна-царкоўнаславянская) мова). | 2 | Пабудаваць схему “Структура лінгвістыкі” з дапамогай сэрвісу diagrams.net. | Прэзентацыя ў фармаце .pptx або .pdf |
| 2. | **Славяне і славянскія мовы** (Звесткі з гісторыі вывучэння старaславянскай мовы (адкрыццё, выданне і апісанне помнікаў, вывучэнне фанетыкі і граматыкі; працы М.В.Ламаносава, І.Добраўскага, А.Х.Вастокава, І.І.Сразнеўскага, П.Шафарыка, Ф.Міклашыча, В.Ягіча, П.Ф.Фартунатава, А.А.Шахматава, Я.Ф.Карскага, А.М.Сялішчава і інш.) Характарыстыка навуковай і навучальнай літаратуры па старaславянскай мове). | 2 | Падрыхтаваць рэфераты пра жыццё і дзейнасць лінгвістаў | Прэзентацыя ў фармаце .pptx або .pdf |
| 3. | **Лексічны склад старaславянскай мовы** (Лексіка старaславянскай мовы паводле паходжання). | 2 | Выканаць практыкаванне [5, практ. 112, с. 50]. | Вуснае практыкаванне |
| 4. | **Фразеалогія старaславянскай мовы** (Фразеалагізмы старaславянскага паходжання ў беларускай мове). | 4 | Распрацаваць эксперыментальны слоўнікавы артыкул для “Слоўніка фразеалагізмаў старaславянскага паходжання” Падабраць адпаведнікі ў беларускай мове да старaславянскіх фразем (10–15) | Пісьмовае заданне |
| 5. | **Асаблівасці фанетычнай сістэмы праславянскай мовы** (Адлюстраванне ў старaславянскай мове праславянскай гукавой сістэмы позняга перыяду). | 2 | Выканаць практыкаванне [5, практ.13, с.7]. | Пісьмовае практыкаванне |
| 6. | **Сістэма галосных гукаў** (Фізіялагічная характарыстыка і класіфікацыя галосных гукаў, перадача іх на пісьме). | 2 | Скласці слоўнік па тэме з дапамогай рэкамендаваных тэарэтычных крыніц | Канспект |
| 7. | **Паходжанне галосных гукаў** (Пераўтварэнні славянскіх галосных [**ě**] (ѣ) у [**а**], [**о**] у [**е**]). | 2 | Скласці слоўнік па тэме з дапамогай рэкамендаваных тэарэтычных крыніц. | Канспект |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 8. | **Сістэма зычных гукаў, іх паходжанне** (Палаталізацыя (памякчэнне) зычных пад уздзеяннем галосных пярэдняга рада. Памякчэнне зычных перад [**j**]. Вынікі пераўтварэнняў праславянскіх спалучэнняў **rj**, **nj**, **lj**, **gj**, **kj**, **chj**, **sj**, **zj**, **skj**, **zgj**, **zdj**, **stj**; змяненні спалучэнняў **dj**, **tj**, а таксама **bj**, **pj**, **mj**, **vj**; лёс спалучэнняў тыпу **slj**, **snj**, **drj** і некаторых іншых.<br>Чаргаванні зычных, выкліканыя ўздзеяннем галосных пярэдняга рада і [**j**]). | 2 | Зрабіць тэставыя заданні № 8−17, варыянт 1 [5, с.68−69]. | Тэставыя заданні |
| 9. | **Пазіцыйныя змяненні галосных і зычных гукаў** (Чаргаванне галосных гукаў. Узнікненне і характар індаеўрапейскіх чаргаванняў галосных. Колькасныя, якасныя і якасна-колькасныя чаргаванні. Асноўныя тыпы чаргаванняў галосных у славянскіх мовах. Марфалагічнае значэнне чаргаванняў галосных у славянскіх мовах). | 2 | Зрабіць тэставыя заданні № 4-7, варыянт 2 [5, с.70]. | Тэставая работа |
| 10. | **Пазіцыйныя змяненні галосных і зычных** (Спрашчэнне груп зычных у праславянскі перыяд і адлюстраванне гэтага спрашчэння ў старaславянскай мове. Змяненне спалучэнняў **ds**, **ts**, **bs**, **ss**, **ps** у **s**; **ks** у **ch**; **pn**, **dn**, **tn**, **dn** у **n**; **dt**, **pt** у **t**; **dm**, **tm** у **m**; **dv** у **v**; **skn** у **sn**; **kst** у **st**. Пытанне аб спрашчэнні спалучэнняў **dl**, **tl** у **l**.<br>Дысіміляцыя ў спалучэннях **dt** і **tt**). | 4 | Выканаць заданне № 32 [5, с.14].<br><br>Перакласці тэкст, растлумачыць чаргаванні зычных [4, № 34, с.14]. | Пісьмовае заданне<br><br>Пісьмовы пераклад з дадатковым заданнем |
| 11. | **Назоўнік**<br>(Узнікненне катэгорыі адушаўлёнасці. Адлюстраванне ў помніках пісьменнасці тэндэнцыі да ўніфікацыі некаторых склонавых формаў). | 2 | Зрабіць частковы марфалагічны аналіз назоўнікаў [5, кантрольная праца № 2, заданне 2, с.58]. | Марфалагічны аналіз |
| 12. | **Граматычныя асаблівасці назоўнікаў** (Чаргаванні зычных гукаў асновы пры ўтварэнні склонавых формаў). | 2 | Выканаць параўнальны аналіз марфалагічных адзінак [5, № 41, с.17]. | Параўнальны аналіз склона-вых формаў |
| 13. | **Займеннік. Несабовыя займеннікі** (Асаблівасці скланення займенніка вьсь ‘увесь’). | 4 | Зрабіць марфалагічны разбор займенніка вьсь [5, № 50, с. 21 ].<br>Вызначыць марфа-лагічныя прыметы неасабовых займенні-каў [5, № 51, с. 22]. | Марфалагічны разбор<br><br>Марфалагічны аналіз |
| 13. | **Прыметнік. Разрады прыметнікаў** (Фанетычныя пераўтварэнні ў канчатках поўных прыметнікаў). | 2 | Вызначыць фанетыч-ныя асаблівасці поўных прыметнікаў [5, практ. | Вуснае практыкаванне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | 54, с. 23]. | |
| 14. | **Прыметнік. Ступені параўнання якасных прыметнікаў** (Утварэнне кароткіх і поўных формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў). | 2 | Выканаць марфемны разбор якасных прыметнікаў [5, № 58, с. 24]. | Марфемны разбор |
| 15. | **Дзеяслоў** (Спрагальныя і неспрагальныя (іменныя) дзеяслоўныя формы). | 2 | Пабудаваць схему "Спрагальныя і неспрагальныя (іменныя) дзеяслоўныя формы" з дапамогай сэрвісу diagrams.net. | Прэзентацыя ў фармаце .pptx або .pdf |
| 16. | **Сістэма часоў дзеяслова. Лад дзеяслова** (Іменныя формы дзеяслова. Інфінітыў і супін, іх утварэнне). | 2 | Зрабіць параўнальны аналіз інфінітыва і супіна [4, № 76, с. 33]. | Параўнальны аналіз (пісьмова) |
| 17. | **Дзеепрыметнік** (Скланенне іменных (нячленных) і поўных (членных) дзеепрыметнікаў). | 2 | Праскланяць дзеепрыметнікі [5, практ. 84, с. 35]. | Вуснае практыкаванне |
| 18. | **Прыслоўе** (Разрады прыслоўяў па значэнні (прыслоўі месца, часу, меры, спосабу дзеяння і інш.)). | 2 | Пабудаваць схему "Разрады прыслоўяў па значэнні" з дапамогай сэрвісу diagrams.net. | Прэзентацыя ў фармаце .pptx або .pdf |
| 19. | **Службовыя часціны мовы** | 2 | Пабудаваць схему "Службовыя часціны мовы" з дапамогай сэрвісу diagrams.net. | Прэзентацыя ў фармаце .pptx або .pdf |
| 20. | **Словазлучэнне** (Асаблівасці дапасавання ў стараславянскай мове). | 2 | Пабудаваць схему "Асаблівасці дапасавання ў стараславянскай мове" з дапамогай сэрвісу diagrams.net. | Прэзентацыя ў фармаце .pptx або .pdf |
| 21. | **Просты і складаны сказы** (Складаныя сказы са злучнікамі і без злучнікаў. Складаназалежныя сказы. Ужыванне злучнікаў і злучальных слоў. Зварот "давальны самастойны"). | 2 | Перакласці і прааналізаваць тэкст на сінтаксічным узроўні [5, № 100, с. 63]. | Пераклад і аналіз тэксту на сінтаксічным узроўні |

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “СТАРАСЛАВЯНСКАЯ МОВА”

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

1. Вусны кантроль:

– франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках,

– калёквіумы,

– даклады на канферэнцыях,

– вусны аналіз тэксту старaславянскага пісьменства,

– вусны залік.

2. Пісьмовы кантроль:

– тэрміналагічныя дыктанты,

– кантрольныя работы,

– пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях,

– рэфераты,

– пісьмовы аналіз стараславянскага тэксту,

– пісьмовы залік.

3. Тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

## ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “СТАРАСЛАВЯНСКАЯ МОВА”

1. Старaславянская мова як агульная для многіх славян найстаражытнейшая пісьмова-літаратурная (старажытна-царкоўнаславянская) мова.
2. Лінгвістычнае, гісторыка-культурнае і навучальнае значэнне вывучэння стараславянскай мовы. Роля стараславянскай мовы ў гісторыі беларускай літаратурнай мовы.
3. Паняцце праславянскай мовы як дапісьмовай фазы развіцця славянскіх моў. Месца стараславянскай мовы сярод іншых славянскіх моў. Народная (дыялектная) аснова стараславянскай мовы.
4. Грамадска-гістарычныя ўмовы ўзнікнення пісьменства ў славян. Пытанне пра ўзнікненне пісьменнасць у славян да Канстанціна (Кірылы) і Мяфодзія. Значэнне славянскага пісьменства ў барацьбе за культурную і дзяржаўную незалежнасць славян. Дзейнасць Канстанціна і Мяфодзія ў Панонii і Вялікай Маравіі.
5. Росквіт славянскага пісьменства ў Балгарыі ў IX – X стст. Прыняцце хрысціянства ўсходнімі славянамі; роля царкоўных кніг і стараславянскай мовы.
6. Славянскія азбукі, пытанне пра іх паходжанне. Кірылаўская азбука.
7. Найважнейшыя глагалічныя і кірылаўскія помнікі, іх кароткая палеаграфічная і моўная характарыстыка. Лёс стараславянскага пісьменства ў розных славянскіх краінах: помнікі з чэха-мараўскімі, сербскахарвацкімі і ўсходнеславянскімі асаблівасцямі.
8. Звесткі з гісторыі вывучэння стараславянскай мовы (адкрыццё, выданне і апісанне помнікаў, вывучэнне фанетыкі і граматыкі; працы М.В.Ламаносава, І.Добраўскага, А.Х.Вастокава, І.І.Сразнеўскага, П.Шафарыка, Ф.Міклашыча, В.Ягіча, П.Ф.Фартунатава, А.А.Шахматава, Я.Ф.Карскага, А.М.Сялішчава і інш.).
9. Лексіка і фразеалогія стараславянскай мовы
10. Уяўныя стараславянізмы. Семантыка-тэматычная характарыстыка стараславянскай лексікі. Семантычныя дублеты. Лексіка стараславянскай мовы паводле паходжання.
11. Невытворныя, вытворныя і складаныя словы. Найбольш прадуктыўныя спосабы словаўтварэння.
12. Фразеалагізмы стараславянскага паходжання ў беларускай мове.
13. Адлюстраванне ў стараславянскай мове праславянскай гукавой сістэмы позняга перыяду.
14. Рэалізацыя ў стараславянскай мове тэндэнцыі да кансалідацыі склада. Тэндэнцыя да ўзыходнай гучнасці склада. Дзеянне тэндэнцыі да гармоніі склада ў стараславянскай мове.
15. Фізіялагічная характарыстыка і класіфікацыя галосных гукаў, перадача іх на пісьме. Галосныя лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя, насавыя і

ненасавыя (чыстыя), поўнага (доўгія і кароткія) і няпоўнага (звышкароткія, або рэдукаваныя) утварэння.

16. Паходжанне галосных гукаў стараславянскай мовы. Фарміраванне славянскай сістэмы галосных гукаў на базе сістэмы галосных індаеўрапейскай мовы-асновы і на базе славянскага моўнага матэрыялу.

17. Узнікненне праславянскіх галосных [а], [о], [е], [ы], [ь], [ъ] на месцы доўгіх і кароткіх галосных індаеўрапейскай мовы.

18. Пераўтварэнні славянскіх галосных [ě] (h) у [а], [о] у [е]. З'яўленне славянскіх галосных [у], [ę] (В), [ç] (@) у выніку дзеяння тэндэнцыі да ўзыходнай гучнасці склада.

19. Галосныя дваякага паходжання: манафтангічныя і дыфтангічныя [и], [ě] (h).

20. Фізіялагічная характарыстыка і класіфікацыя зычных гукаў, перадача іх на пісьме. Суадноснасць зычных паводле цвёрдасці-мяккасці ў стараславянскай мове. Зычныя цвёрдыя, мяккія і памякчоныя.

21. Паходжанне зычных гукаў стараславянскай мовы. Паходжанне цвёрдых зычных. Паходжанне цвёрдых санорных гукаў, а таксама гукаў [к], [х], [с] і [з]. З'яўленне славянскага фрыкатыўнага звонкага гука [в].

22. Фрыкатыўны глухі гук [ф] у стараславянскай мове, яго паходжанне. Паходжанне мяккіх зычных. Зычны [j] і яго паходжанне.

23. Палаталізацыя (памякчэнне) зычных пад уздзеяннем галосных пярэдняга рада.

24. Памякчэнне зычных перад [j]. Вынікі пераўтварэнняў праславянскіх спалучэнняў rj, nj, lj, gj, kj, chj, sj, zj, skj, zgj, zdj, stj.

25. Змяненні спалучэнняў dj, tj, а таксама bj, pj, mj, vj.

26. Лёс спалучэнняў тыпу slj, snj, drj і некаторых іншых.

27. Чаргаванні зычных, выкліканыя ўздзеяннем галосных пярэдняга рада і [j].

28. Рэдукаваныя (звышкароткія) галосныя [ь], [ъ]. Змяненне іх перад і, j у рэдукаваныя (звышкароткія) [и], [ы].

29. Узнікненне рэдукаваных (звышкароткіх) [и], [ы] на месцы галосных поўнага ўтварэння [и], [ы] перад j. Рэдукаваны [и] на месцы спалучэння jь.

30. Перадача рэдукаваных (звышкароткіх) [и], [ы] на пісьме. Моцная і слабая пазіцыя рэдукаваных (звышкароткіх). Падзенне рэдукаваных (звышкароткіх) галосных і змены, выкліканыя гэтым працэсам. Вынікі падзення рэдукаваных (звышкароткіх).

31. Галосныя гукі ў пачатку слова. Галосныя, якія маглі пачынаць слова ў стараславянскай мове. Прыстаўныя зычныя [в] і [j] перад пачатковымі галоснымі. Пачатковыя ~ і е, а і В, ю і оу ў помніках стараславянскага пісьменства.

32. Чаргаванне галосных гукаў. Узнікненне і характар індаеўрапейскіх чаргаванняў галосных. Колькасныя, якасныя і якасна-колькасныя чаргаванні. Асноўныя тыпы чаргаванняў галосных у славянскіх мовах. Марфалагічнае значэнне чаргаванняў галосных у славянскіх мовах.

33. Спалучэнне плаўных *r* і *l* з галоснымі. Змяненне дыфтангічных спалучэнняў *or, *ol, *er, *el паміж зычнымі.

34. Дыфтангічныя спалучэнні *or, *ol у пачатку слова перад зычным і лёс спалучэнняў тыпу *ort, *olt у славянскіх мовах.

35. Праславянскія спалучэнні плаўных з рэдукаванымі (звышкароткімі) [ь], [ъ] тыпу *trьt, *tlьt, *trъt, *tlъt у старaславянскай і іншых славянскіх мовах.

36. Спрашчэнне груп зычных у праславянскі перыяд і адлюстраванне гэтага спрашчэння ў старaславянскай мове. Змяненне спалучэнняў ds, ts, bs, ss, ps у s; ks у ch; pn, dn, tn, dn у n; dt, pt у t; dm, tm у m; dv у v; skn у sn; kst у st.

37. Дысіміляцыя ў спалучэннях dt і tt.

38. Змяненні ў канцы слова: страта канцавога зычнага; рэдукцыя канцавых галосных і інш.

39. Катэгорыя роду, ліку і склону.

40. Узнікненне катэгорыі адушаўлёнасці.

41. Адлюстраванне ў помніках пісьменнасці тэндэнцыі да ўніфікацыі некаторых склонавых формаў.

42. Катэгорыя роду, ліку і склону назоўнікаў.

43. Тыпы скланення назоўнікаў.

44. Чаргаванні зычных гукаў асновы пры ўтварэнні склонавых формаў.

45. Асабовыя займеннікі 1-ай і 2-ой асобы (азъ, ты) і зваротны займеннік себе, іх скланенне.

46. Поўныя і энклітычныя формы асабовых і зваротнага займеннікаў, іх ужыванне. Спосабы выражэння 3-яй асобы формамі ўказальных займеннікаў è ‘той’ (",  ~), онъ (оно, она).

47. Неасабовыя займеннікі, іх класіфікацыя паводле значэння. Скланенне займеннікаў.

48. Разрады прыметнікаў у старaславянскай мове. Утварэнне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.

49. Кароткія (іменныя) і поўныя (членныя, займеннікавыя) формы прыметнікаў; адрозненне ў іх граматычным значэнні і сінтаксічным ужыванні.

50. Скланенне кароткіх (іменных) прыметнікаў. Утварэнне і асаблівасці скланення поўных (членных, займеннікавых) прыметнікаў. Фанетычныя пераўтварэнні ў канчатках поўных прыметнікаў.

51. Утварэнне кароткіх і поўных формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў. Скланенне кароткіх і поўных формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў.

52. Лікавыя словы ў старaславянскай мове.

53. Агульныя граматычныя катэгорыі старaславянскага дзеяслова. Спрагальныя і неспрагальныя (іменныя) дзеяслоўныя формы. Дзеяслоўныя асновы: аснова цяперашняга часу і аснова інфінітыва. Дзеяслоўныя формы простыя і складаныя.

54. Формы цяперашняга часу. Тэматычныя і нетэматычныя дзеясловы. Размеркаванне дзеясловаў па класах. Чаргаванні галосных у дзеяслоўных парадыгмах.

55. Сістэма прошлых часоў. Простыя формы. Аорыст, яго значэнне. Аорыст просты і сігматычны. Імперфект, яго значэнне, утварэнне і спражэнне. Складаныя формы. Перфект і плюсквамперфект, іх значэнне, утварэнне, спражэнне.

56. Сістэма будучых часоў. Будучы просты, будучы складаны І і будучы складаны ІІ.

57. Утварэнне формаў загаднага і ўмоўнага ладу.

58. Іменныя формы дзеяслова. Інфінітыў і супін, іх утварэнне.

59. Дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу незалежнага і залежнага станаў. Скланенне іменных (нячленных) і поўных (членных) дзеепрыметнікаў.

60. Разрады прыслоўяў па значэнні (прыслоўі месца, часу, меры, спосабу дзеяння і інш.) Класіфікацыя прыслоўяў паводле паходжання. Утварэнне прыслоўяў.

61. Прыназоўнік.

62. Злучнік.

63. Часціцы.

64. Асаблівасці дапасавання ў старaславянскай мове. Дапасаванне па сэнсу. Беспрыназоўнікавае і прыназоўнікавае кіраванне.

65. Парадак слоў у сказе. Спосабы выражэння дзейніка і выказніка і асаблівасці іх каардынацыі. Канструкцыі з падвойнымі склонамі. Дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні. Адмоўныя сказы. Аднасастаўныя сказы.

66. Складаныя сказы са злучнікамі і без злучнікаў. Складаназалежныя сказы. Ужыванне злучнікаў і злучальных слоў. Зварот “давальны самастойны”. Спосабы перадачы чужой мовы.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Беларуская дыялекталогія”, “Гісторыя беларускай мовы”, “Практыкум па беларускай мове” | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі (пратакол № __ ад _________ г.). |